# ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

УДК 821.161

**Бразгуноў Аляксандр Уладзіміравіч**
кандыдат філалагічных навук, дактарант
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
г. Мінск, Беларусь

**Brazgunou Alaxandr**
PhD in Philology, Post-Doctoral Student
Centre of Studies of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus
Minsk, Belarus
beowulf.bel@gmail.com

## АЎТАРСКІ ПАЧАТАК ВА «ЎСПАМІНАХ» Ф. ЕЎЛАШОЎСКАГА

## AUTHOR'S PRESENCE IN "THE MEMOIRS" BY F. JEULAŠOUSKI

Статья посвящена проблеме авторского начала в одном из наиболее ранних памятников белорусской мемуаристики начала XVII в. – «Воспоминаниях» Ф. Евлашовского. В данном произведении авторское начало, понимаемое как проявление авторской субъективности в тексте, прослеживается на уровнях интенции, мотива, композиции, хронотопа, сюжета и образа. На всех названных уровнях оно обусловлено не только жанровой природой мемуаров, но и особенностями мировоззрения автора и его жизненными приоритетами.

Ключевые слова: *авторское начало*; *интенция*; *мемуары*; *стиль*; *субъективность*.

The article deals with the problem of the author's presence in one of the earliest monuments of Belarusian memoir literature of the beginning of the 17th century – "The Memoirs" by F. Jeulašouski. In this work, the author's presence, understood as the manifestation of an author's subjectivity in the text, can be traced on the levels of intention, motif, composition, chronotope (time and space unity), plot, and image. On the levels mentioned, it is determined not only by the memoir genre characteristics, but by the peculiarities of the author's world-view and his life priorities.

Key words: *author's presence*; *intention*; *memoirs*; *style*; *subjectivity*.

Кожны мастацкі твор нашага часу афарбаваны непаўторнай аўтарскай індывідуальнасцю. Штуршок да яго ўзнікнення – інтэнцыя творчай асобы. На этапах фальклорнага развіцця і станаўлення пісьменства індывідуальнасць, суб'ектыўнасць аўтара(ў) «хавалася» за ананімным калектыўным пачаткам, калі «твор хутчэй усведамляецца як плод жыццядзейнасці калектыва» [1, с. 11]. У пазнейшыя эпохі, да самай сярэдзіны XVIII ст., творчая ініцыятыва была абмежавана жанравымі і стылявымі канонамі, аўтар, як правіла, арыентаваўся на пэўныя ўзоры і «гатовае» слова, зададзенае рыторыкай і нарматыўнай паэтыкай. Тым не менш любы мастацкі твор, у тым ліку ананімны, немагчымы без аўтара, паколькі «аўтарская суб'ектыўнасць арганізуе твор і спараджае яго мастацкую цэласнасць» [2, с. 69].

Адпаведна, пад *аўтарскім пачаткам* варта разумець любыя праявы аўтарскай суб'ектыўнасці ў тэксце твора. Хаця А. М. Потсар наогул прапануе лічыць аўтарскім пачаткам любыя кампаненты тэкста, якія могуць сведчыць пра наяўнасць у ім суб'екта маўлення, [3, с. 88].

Па вялікім рахунку, кожны твор, узяты ў сваёй тэкставай завершанасці (як з боку аб'ектнай, так і суб'ектнай арганізацыі), ёсць выяўленне аўтарскай суб'ектыўнасці. Увесь матэрыял, адабраны аўтарам, як і той, ад якога ён з нейкіх прычын адмаўляецца на пэўным этапе, з'яўляецца выражэннем яго волі, светапогляду, розных перакананняў, прыярытэтаў і г.д. Нас, аднак, цікавяць праявы суб'ектыўнасці, якія ўсё ж застаюцца ў канчатковым тэсце. Якім жа чынам, пасродкам чаго яны выяўляюцца?

У гэтым аспекце каштоўнасць «Успамінаў» Ф. Еўлашоўскага для прадмета нашага даследавання неацэнная. Па-першае, гэта адзін з найбольш ранніх помнікаў мемуарнага жанру ў айчынным пісьменстве. Не маючы гатовага ўзору, аўтар арыентаваўся на традыцыі мясцовага летапісання з яго храналагічнай паслядоўнасцю выкладу. Па-другое, факты і падзеі тлумачацца і ацэньваюцца аўтарам на аснове асабістых уражанняў, а значыць, з суб'ектыўнай пазіцыі. Па-трэцяе, у адрозненне ад дзённікаў (дыярыушаў), што пісаліся непасрэдна па слядах падзей, гэта менавіта мемуары, у якіх мінулае апісана праз пэўны час, рэтраспектыўна. Пэўныя страты ў дакладнасці і падрабязнасці апісання былі тут непазбежныя, але, з іншага боку, з часавай адлегласці аўтар меў магчымасць вызначыць сапраўды істотнае. У выніку твор ўзбагаціўся заўвагамі, тлумачэннямі, разгорнутымі апісаннямі і разважаннямі, у якіх аўтар раскрыў свае светапоглядныя, аксіялагічныя, анталагічныя, грамадска-палітычныя погляды.

Пры напісанні ўспамінаў Ф. Еўлашоўскі, несумненна, кіраваўся суб'ектыўнай мэтай, інтэнцыяй, якая раскрывае і прычыну напісання твора: пакінуць нашчадкам звесткі пра сябе і тыя падзеі жыцця, якія ён палічыў вартымі ўвагі. З аднаго боку, гэта інтэнцыя, абумоўленая самой жанравай прыродай твора (мемуары). З іншага, заўважна, што Ф. Еўлашоўскі пастаянна суадносіць падзеі свайго жыцця з вышняй воляй і провідам, пры кожнай магчымасці дзякуе Богу за дзяцей, жонку, ворагаў, за тое, што *не опустил ме и с тою малжонкою моею, и не подавал нас на волю непритяелей наших* [4, с. 42]. Аднак падобны пасаж – не столькі традыцыйнае рытарычнае аздабленне, колькі выяўленне светапогляднай пазіцыі. Успрынятая ў такім аспекце, інтэнцыя «Успамінаў» выяўляецца больш складанай праявай суб'ектыўнасці аўтара: гэта не толькі памяць і ўзор паводзін для нашчадкаў, але і падзяка Усявышняму за жыццё і падтрымку ў выпрабаваннях. Практычнае прызначэнне запісаў, традыцыйнае для пісьменства разгляданай эпохі, спалучаецца з дыдактычнымі і аксіялагічнымі задачамі.

Суб'ектыўнасць знаходзіць выяўленне і на кампазіцыйным узроўні твора: ва ўступе аўтар паведамляе пра абставіны свайго нараджэння і пэўныя факты з ранніх гадоў, у асноўнай частцы змяшчае пагадовыя запісы (яны вар'іруюцца ад простых летапісных згадак да разгорнутых

апісанняў), у эпілогу дзякуе Богу, што зайздрасць *никгды сэрцэм моим не пановала и непотребного (...) жалю, хоробе якейсь подобного, не чинила* [4, с. 64]. Гэты матыў удзячнасці Найвышэйшаму праходзіць праз увесь твор і знаходзіць выяўленне ў пэўных слоўных формулах (*Хвалилэм насветше име Его; Дякую я тобе, Боже мой; Самому Пану Богу хвала за его оборону* і інш.). Нярэдка ён выступае побач з матывам злачынства і пакарання, як у выпадку амаральнага ўчынку Тлухоўскага і Крачатоўскага, слуг Яна Геранiма Хадкевіча, якія дзякуючы сваім махлярскім здольнасцям сталі ўласнікамі маёнткаў, асобныя з якіх былі паабяцаны сыну мемуарыста. Даведаўшыся пра смерць Тлухоўскага, аўтар адзначае, што гэта не так усцешыла яго, як умацавала ў веры ў Бога і Яго заступніцтва. Нават пасля забойства Бруханскім свайго сына Яна не губляе Еўлашоўскі веры ў справядлівасць: Бог *ми скутэчнон справедливость и экзэкуцыю учинить рачи* ‘адплаціць справядліва і пакарае за мяне’ [4, с. 70]. Як бачым, злачынства і пакаранне паслядоўна інтэрпрэтуюцца ў адапаведнасці з рэлігійнымі перакананнямі – як выпрабаванне і справядлівая адплата.

З дапамогай пачатковай (*Самому Пану Богу моему за всяких добродейств Его* [4, с. 32]) і заключнай фраз (*Дзякую я Тобе, Боже мой, Ойче Пана нашого Езуса Христа* [4, с. 64]) дзеянне фармальна ўключаецца ў хранатоп біблейскай гісторыі. Аднак гэта, хутчэй, абрамленне, бо асноўнае апісанне дзеецца ў межах хранатопу чалавечай гісторыі, які ўбірае ў сябе і ўнутраны хранатоп аўтара. Такім чынам, мы маем справу з трыма ўзроўнямі: Божы свет – свет чалавецтва – унутраны свет аўтара. Аўтар «дзейнічае» на двух апошніх, паколькі Божы свет у свядомасці чалавека пачатку XVII ст. па-ранейшаму разглядаецца як нязменны, раз і назаўсёды вызначаны, а значыць, нарматыўны для астатніх узроўняў. «Успаміны» служаць сведчаннем, што іх аўтар выразна ўсведамляе значэнне трох узаемазвязаных часавых пластоў для асабістай гісторыі: мінулага (існуе гісторыя майго індывідуальнага жыцця), сучаснасці (я пішу пра яе цяпер) і будучыні (напісанае мной павінна паслужыць для нашчадкаў узорам пабожнага жыцця).

Сюжэт «Успамінаў», як і інтэнцыя, абумоўліваецца іх жанравай прыродай, а таксама паслядоўнасцю тых грамадскіх і прыватных падзей, што адбываліся ў жыцці аўтара. Мемуарыстыка XVII–XVIII ст. ведала толькі два тэматычна адасобленыя тыпы твораў – *Otia publica* і *Otia domestica* ‘Грамадскія забавы’ і ‘Хатнія забавы’ [5, с. 10]. Таму падача звестак агульнагістарычнага характару ў спалучэнні з асабістымі, узбагачаная суб’ектыўнымі ацэнкамі, надае адметнасць сюжэтнай будове твора, у цэлым заснаванай на храналагічным прынцыпе, з характэрным для летапісання датаваннем. Ф. Еўлашоўскі імкнецца як мага дакладней падаць звесткі, датычныя яго асабіста: паведамляе, што нарадзіўся ў 1546 г. *месяца февраля семого дня, в неделю ночи пришлое около повночи* [4, с. 32], а апошні запіс датуе *року 1604, стычня 2 дня* [4, с. 64]. Ён паслядоўна пазначае істотныя падзеі ў жыцці сям’і – шлюб, смерць бацькоў, нараджэнне дзяцей. Многія выпадкі са штодзённага жыцця беларускай шляхты пад пяром аўтара разгортваюцца ў бытавыя замалёўкі або навелізаваныя аповеды. А вось падзеі, звязаныя з грамадскай

гісторыяй, нават надзвычайнай значнасці, пераважна застаюцца на перыферыі аўтарскай увагі. Так, даецца ацэнка Лівонскай вайны, паведамляецца пра Люблінскую унію і вайну Рэчы Паспалітай са Швецыяй, абмалёўваюцца падзеі перыяду *interregnum* 'бескралеўя', але нават не згадваецца Берасцейская царкоўная унія 1596 года. У апошнім выпадку прычынай ігнаравання магло паслужыць пратэстанцкае веравызнанне аўтара, для якога царкоўная унія не мела актуальнага значэння, паколькі закранала адносіны выключна паміж рымска-каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі. Нямала запісаў, здавалася б, выключна інфарматыўнага зместу (напрыклад, *В лютым, 13 дня, под Дэрптэм забито (...) Дмитра Полубенского* [4, с. 63]) суправаджаюцца аўтарскай ацэнкай (*мэжа годного памети, чловека значне рыцэрского*), якая, зрэшты, можа быць успрынята і ў якасці топаса, формулы, традыцыйнай для фунеральных запісаў. А вось адмову ад падрабязнага апісання падзей элекцыйнага сойму 1573 г. Ф. Еўлашоўскі фармулюе проста і зразумела: *Опускаю то, яко ведучи достаточне то от инших выписано* [4, с. 38]. Гэта выразна кантрастуе з пануючым у тагачасным пісьменстве ВКЛ топасам «напішы лепш сам, а не дакарай мне» (С. Кулакоўскі, М. Стрыйкоўскі, Я. Пратасовіч, А. Рымша і інш.) і імкненнем аўтараў выступаць у якасці ўсяведных асоб.

Зразумела, што пры апісанні падзей жыцця – прыватнага і грамадскага – Ф. Еўлашоўскі быў вымушаны ажыццявіць іх суб'ектыўны адбор. Што магло паслужыць крытэрыем такога адбору? Звяртае на сябе ўвагу, што аўтар ажыўляе ці разгортвае аповед пераважна тады, калі вядзе гаворку пра ўласныя пачуцці і адчуванні. Менавіта таму пра свой удзел у Лівонскай вайне ён выказваецца сцісла, але эмацыйна насычана: *А потом аж до уприкреня были ми частые язды на тые войны, мало потребные, бовем же и Речи Посполитой пожитку не веле тэ войны приносили* [4, с. 32]. Асноўную віну за рэлігійную нязгоду ў дзяржаве, дзе раней рознасць веравызнання не перашкаджала сяброўству, а цяпер *ани се пытай о милость, щирость и правдиве добрэ заховане* [4, с. 33], ён ускладае на свецкія станы. Гэты пасаж тым больш каштоўны для выяўлення светапогляду, што далей пісьменнік выказвае жаданне, каб падзеленыя нязгодай хрысціяне з большай павагай ставіліся да найвышэйшага хрысціянскага манарха, папы (!), якога прыпадабняе бацьку вялікай сям'і, *который сынов своих и розных от себе и от друкгей братеи в обычаех знашать умел* [4, с. 34].

Эмацыйная ўраўнаважанасць – адна з асноўных характарыстык аўтарскага стылю Ф. Еўлашоўскага. Іншая, не менш характэрная прыкмета – дакладнасць і выразнасць, сцісласць фармулёвак, як, напрыклад, у выпадку Яна Адахоўскага, якога аўтар характарызуе наступным чынам: *чловек в чужых краинах длуго бывалый и велце добрый, и мой приятель правдивый* [4, с. 63]. На стыль аўтара, несумненна, паўплывала яго прафесійная дзейнасць: яму даводзілася прымаць удзел у судовых паседжаннях, выконваць пасольскія функцыі на соймах рознага ўзроўню, а таксама займацца заканатворчай дзейнасцю (ён адзін з аўтараў «Трыбуналу абывацелям Вялікага Княства Літоўскага», кодэкса вышэйшага апеляцыйнага суда дзяржавы).

Выпрацаваная падчас удзелу ў паседжаннях назіральнасць і ўважлівасць развіла ў Ф. Еўлашоўскім здольнасць даваць сучаснікам адметныя характарыстыкі – для выказвання асабістага стаўлення яму часам дастаткова трапнага слова, згадвання пэўнай дэталі, рысы характару. Майстэрскае валоданне такімі характарыстыкамі нярэдка спрыяла стварэнню запамінальнага вобраза, паколькі любы мемуарыст «грунтуецца пераважна на ўласных непасрэдных уражаннях і ўспамінах; пры гэтым паўсюль на пярэднім плане або ён сам, або яго пункт гледжання на тое, што апісваецца» [6, с. 216]. Так, згадваючы пахаванне першай жонкі пана Івана Бакі, аўтар надзяляе яе такімі характарыстыкамі, як *богобойна, уроды пекнэй, а покоры векшей, як вере* [4, с. 45], і процiпастаўляе ёй другую, *наддэр скупую, ктора до зэбраня пенезей ему помогла (...) и з людскости его звыклое отвела* [Там жа]. (Магчыма, сімпатыя да першай жонкі была абумоўлена асабістай удзячнасцю, бо пры яе жыцці Іван Бака падараваў пісьменніку *кони зэ три*, а пасля паўторнай жаніцьбы *ни козлентка*.) Згадваючы перабыванне караля Стафана Баторыя ўлетку 1586 г. у Гародні, Ф. Еўлашоўскі лічыць неабходным зазначыць, што той *се тэж часом капэлюшэм и рукавицами не мерзил, з чого венкгрове сперва шидили* (смяяліся, кпілі. – А. Б.) [4, с. 53–54]. Такая дэталь, на першы погляд, нязначная, характарызуе С. Баторыя як адкрытага да мясцовай культурнай традыцыі чалавека, што пацвярджаецца шматлікімі тагачаснымі крыніцамі.

Прафесійнымі навыкамі Ф. Елашоўскага трэба, відаць, патлумачыць і яго цікавасць да крымінальных здарэнняў, як у выпадку з *москвитином* У. Забалоцкім, забітым у 1580 г. у Вільні нейкім Гарэцкім [4, с. 46–48]. Тут апісанне набліжаецца да разгорнутага апавядання. Як сапраўдны следчы, Ф. Еўлашоўскі паведамляе прычыну трагічнага здарэння – абразу з боку Крыштафа Радзвіла, вялікага гетмана, перад якім Заблоцкі не зняў шапкі і якога абазваў у адказ; адзначае стан афекту ў «пацярпелага» Радзівіла (*Тэй ночи намней пан троцкий не спал, фрасуюнцсе на Влодымера* [4, с. 46]); апісвае сачэнне за будучай ахвярай з даху дома віленскага войта. Найбольш падрабязнае, блізкае да *инстыкгацыи* ‘абвінаваўчага акту’ апісанне саміх абставін забойства: месца і парадак размяшчэння нападнікаў, асноўны выканаўца, зброя (камень, затым корд), характар смяротнага ранення (*кордом под правон персть*), стан ахвяры (*без мовы*) і час смерці (*вэ двух годинах умарл*). Падобная дэталізацыя стварае эфект прысутнасці (або адчуванне кадра), надае стылёвую адметнасць апісанню, выклікае ў чытача псіхалагічнае напружанне, якое аўтар здымае апісаннем рэакцыі караля на забойства. Ф. Еўлашоўскі, які прызнаецца, што *был добре вядом того Влодымера* [4, с. 48], лічыць неабходным засведчыць уласнае меркаванне з нагоды трагедыі: смерць Забалоцкага стала вынікам непаразумення, паколькі шапкі перад Радзівілам ён не зняў праз вялікую *мелянколию* ‘задумлівасць’, а не пыху; гэта быў прыстойны чалавек, які, пакрыўдзіўшы каго, заўсёды *волал за Бога просечи, абы не мел за зле* ‘дзеля Бога прасіў не трымаць зла’.

Як бачым, аўтар імкнецца пісаць больш пра тое, што пакінула ў яго душы пэўны эмацыйны след, чым пра палітыку, якую, па трапнай заўвазе

А. Ф. Коршунава, «мемуарыст адносіў да кампетэнцыі вялікіх паноў, выбраных дзеля гэтага самім Богам» [7, с. 12]. Ён звяртае ўвагу не толькі на падзейны рад, але і на асоб, якія пэўным чынам аказвалі ўплыў на яго асабісты лёс або пакінулі па сабе незабыўнае ўражанне. Таму побач з каралямі, князямі згадваюцца і суседзі, а таксама «літаратурныя» постаці Ф. Кміты-Чарнабыльскага (аўтара знакамітых лістоў), І. Маскевіча (аўтара дыярыўша) і Р. Осціка (героя ананімнага ляманту 1585 г.).

Асноўным жа ва «Ўспамінах», несумненна, з'яўляецца вобраз самога аўтара. Ён паўстае як высокамаральная асоба, набожны чалавек (схільны, аднак, да прымхаў і забабонаў), які цэніць сумленную працу, абачлівы і сціплы ў паводзінах, рэлігійна талерантны, цэніць сямейныя повязі і вернасць у сяброўстве. Істотна тое, што гэта – тыя маральныя арыенціры, якія аўтар хацеў бы перадаць праз свае ўспаміны нашчадкам і якія шмат гавораць чытачу пра самога аўтара і яго светапогляд.

Важна таксама адзначыць, што ў шэрагу эпізодаў аўтар скіроўвае апісанне непасрэдна на сябе. У прыватнасці, ён тройчы (у запісах за 1566, 1577, 1602 гг.) згадвае стан моцнага здушэння *(Именовали докторове тэ хоробэ инкубусэм* [4, с. 34]), які адчуваў ува сне кожнага разу пасля любога спуду.

Як бачым, Ф. Еўлашоўскі ў сваіх «Успамінах» выяўляецца ва ўсіх трох аўтарскіх іпастасях – як рэальная біяграфічная асоба, як вобраз аўтара, як іманентны твору мастак-творца [2, с. 68–69].

Усё вышэйсказанае дазваляе прыйсці да наступных в ы с н о ў:

- інтэнцыя ў Ф. Еўлашоўскага – гэта не толькі памяць і ўзор паводзін для нашчадкаў (прадвызначаецца жанрам мемуараў), але і падзяка Ўсявышняму за жыццё і падтрымку ў выпрабаваннях (вызначаецца аўтарам);
- падзеі агульнагістарычнага характару падаюцца аўтарам у спалучэнні з асабістымі, ацэньваюцца праз прызму суб'ектыўнага «я», што надае адметнасць сюжэтнай будове твора;
- аўтар ажыўляе і разгортвае аповед пераважна тады, калі жадае выказаць уласныя пачуцці, адносіны, меркаванні наконт прадмета апісання;
- калі матыў удзячнасці Богу выступае побач з матывам злачынства і пакарання, апошні інтэрпрэтуецца Ф. Еўлашоўскім у адапаведнасці з яго рэлігійнымі перакананнямі – як выпрабаванне і справядлівая адплата;
- дакладнасць і выразнасць, сцісласць фармулёвак, увага да дэталі, якая стварае ў чытача эфект прысутнасці – адметныя рысы аўтарскага стылю Ф. Еўлашоўскага, на фарміраванне якога шмат у чым паўплывала яго прафесійная дзейнасць.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Историческая поэтика. Литературные эпохи и типы художественного сознания.* – М. : Наследие, 1994. – 512 с.
2. *Хализев, В. Е.* Теория литературы: учебник / В. Е. Хализев. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Высш. шк., 2002. – 437 с.

3. *Потсар, А. Н.* Авторское начало в текстах массовой коммуникации / А. Н. Потсар // Русская речь в СМИ: Стилистический аспект / под. ред. В. И. Конькова. – СПб. : Изд. С.-Петерб. ун-та., 2007. – С. 81–90.
4. *Еўлашоўскі, Ф.* Успаміны / Ф. Еўлашоўскі // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. / Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; Уклад., уступ. артыкул і камент. А. Ф. Коршунава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – С. 31–122.
5. *Мальдзіс, А.* Белаурсь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 256 с., I л. партр.
6. *Левицкий, Л. А.* Мемуары // Л. А. Левицкий // Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева; Редкол.: Л. Г. Андреев [и др.] – М. : Сов. Энциклопедия, 1987. – С. 216–217.
7. *Коршунаў, А. Ф.* Лепшыя здабыткі старажытнай беларускай мемуарыстыкі / А. Ф. Коршунаў // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. / Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; Уклад., уступ. артыкул і камент. А. Ф. Коршунава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – С. 3–30.

*Поступила в редакцию 17.02.2021*